**Народная** адукацыя // Памяць: Ушацкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. К. Кісялёў [і інш.] ; уклад. М. М. Кірпіч ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Белта, 2003. – С. 499–500.

## НАРОДНАЯ АДУКАЦЫЯ

Пераадолеўшы вялікія цяжкасці, восенню 1944 г. аднавілі сваю работу Ушацкая СШ, Арэхаўская, Ленінская, Гарбаціцкая, Мосарская, Завячэльская, Жарская, Гарадзецкая, Чарапоўшчынская, Велікадолецкая, Весніцкая, Кубліцкая, Плінская сямігодкі і 61 пачатковая школа. За парты сеў 5481 вучань. У школах працавала 229 настаўнікаў.

Цяжка было пачынаць першы пасляваенны навучальны год. Не хапала школьных памяшканняў, не было падручнікаў, пісьмовых прылад.

4 студзеня 1945 г. настаўнікі раёна сабраліся на нараду, на якой прысутнічаў 121 чалавек. Былі разгледжаны пытанні аб выніках першага паўгоддзя, аб дакладзе Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, прысвечанага 27-й гадавіне Кастрычніка, і інш.

Не хапала настаўнікаў са спецыяльнай адукацыяй. Архіўныя дакументы сведчаць, што да пачатку 1947/48 навучальнага года з 263 настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй было 3, незакончанай вышэйшай – 24, з сярэдняй – 153, няпоўнай сярэдняй – 83. У 1953/54 навучальным годзе з 340 настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй было 27, незакончанай вышэйшай – 70, з сярэдняй – 217, незакончанай сярэдняй – 26. У 1959/60 навучальным годзе з 460 настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй было 70, незакончанай вышэйшай – 112, з сярэдняй – 270, няпоўнай сярэдняй – 8.

Ушацкі раён, як і ўся краіна, ужо ў передваенныя гады прыступіў да ўвядзення ўсеагульнай сярэдняй адукацыі ў горадзе і сямігадовай – на вёсцы. Гэту задачу ажыццяўлялі ў раёне 4 сярэднія, 21 сямігадовая і 69 пачатковых школ.

Як успаміналa Н. М. Сідарэнка, былы дырэктар школы ў в. Капцы, даводзілася быць не толькі педагогам і адміністратарам, але і гаспадарнікам, і будаўніком. Працавалі без выхадных і адпачынкаў.

Першымі настаўнікамі, якія ўдастоены высокага звання «Заслужаны настаўнік БССР», у нашым раёне былі Я. Г. Абросава, Н. П. Жукаў, Л. М. Нікалаева.